**В. В. УРУБЛЕЎСКІ**

# МЕТРЫЧНЫЯ КНІГІ ЯК КРЫНІЦА ПА ДАСЛЕДАВАННІ СЯЛЯНСКАЙ ШТОДЗЁННАСЦІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII ст. (па матэрыялах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)

На падставе метрычных кніг уніяцкіх і каталіцкіх парафій, праваслаўных прыходаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) вылучаны аспекты, якія вызначаюць асаблівасці грамадскага і прыватнага жыцця сялян у другой палове XVIII ст.

On the basis of the metric books of uniate, catholic, orthodox parishes from the collections of the National Historical Archives of Belarus (NHAB) defined the main aspects, wich indicate peculiarities of community and personal everyday life of peasants in the second half of the eighteenth century.

*Ключавыя словы*: метрычныя кнігі, сялянства, штодзённасць, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, царква, касцёл.

*Keywords*: registers of births, the peasantry, the everyday life, the National Historical Archive of Belarus, Orthodox church, Catholic church.

Адзін з найлепшых збораў метрычных кніг XVIII ст. на тэрыторыі Беларусі захоўваецца ў НГАБ. Асобныя часткі метрычных кніг па тэрыторыі Беларусі таксама знаходзяцца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы (ДГАЛ) і Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве (РДГА) у Санкт-Пецярбургу.

Метрычныя кнігі грэка-каталіцкай або ўніяцкай канфесіі па другой палове XVIII ст. добра захаваліся і з’яўляюцца найбольш інфарматыўнымі ў справе даследавання сялянскай штодзённасці. Самымі раннімі і поўнымі метрыкамі ўніяцкай царквы лічацца метрычныя кнігі аб на-

**Урублеўскі Вадзім Валер’евіч** — галоўны архівіст аддзела публікацыі дакументаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі.

роджаных і шлюбаваных Пагосцкай царквы Аршанскага павета Віцебскага ваяводства за 1707—1766 гг., аб народжаных і памерлых Жодзінскай царквы Барысаўскага павета за 1745—1794 гг., аб народжаных Вузлянскай царквы Ігуменскага павета за 1744—1799 гг.

Метрычныя касцельныя кнігі рымска-каталіцкай канфесіі па другой палове XVIII ст. захаваліся нераўнамерна. Адны з самых поўных касцельных метрык, якія знаходзіліся па тэрыторыі Беларусі: метрычныя кнігі Барысаўскага за 1700—1797 гг., Быхаўскага за 1707—1798 гг., Бялыніцкага за 1700—1798 гг., Гайненскага за 1701—1799 гг., Глубоцкага за 1700—1799 гг., Глускага за 1701—1800 гг., Слуцкага за 1701—1798 гг., Усялюбскага за 1713—1799 гг. парафіяльных касцёлаў. Толькі метрычная кніга апошняга з прадстаўленых касцёлаў складзена па-польску, астатнія вяліся на лацінскай мове.

Найменш прадстаўлена нешматлікая на той час праваслаўная канфесія, метрычныя кнігі якой даволі цяжка вылучыць з усяго комплексу кніг уніяцкай канфесіі. Найбольш захаванымі ў гэтым плане можна лічыць метрыкі мсціслаўскіх праваслаўных Афанасьеўскай аб хрышчаных, шлюбаваных і памерлых за 1780—1784 гг. і Успенскай аб хрышчаных і памерлых за 1778—1779 гг. цэркваў.

Асобныя рысы штодзённасці сялянства ў другой палове XVIII ст. адлюстраваны менавіта ва ўніяцкіх, каталіцкіх і праваслаўных метрычных кнігах другой паловы XVIII ст.

Нараджэнне дзіцяці ў сям'і было падзеяй прыватнага жыцця сялянскай сям'і, аднак яго хрышчэнне з'яўлялася сродкам уключэння нованароджанага ў сацыяльны калектыў. Хросныя або «кумы» выступалі ў якасці давераных асоб сялянскай грамады, якія павінны несці адказнасць за духоўнае жыццё дзіцяці да моманту яго паўналецця. Цяжкасць сялянскага быту патрабавала практычнасці, а менавіта матэрыяльнай дапамогі. Не выключана, што хроснае сваяцтва з прадстаўнікамі духавенства і шляхты, а значыць мясцовай эліты, магло прынесці сялянам плён.

У метрычных кнігах усяго XVIII ст., якія характарызуюцца адсутнасцю фармуляра складання, падзея нараджэння не фіксавалася. У сярэднім у Пагосцкай парафіі хрысціліся 16—19 дзяцей за год. Усплёск хрышчэнняў прыходзіўся на студзень — сакавік, кастрычнік — лістапад, якраз на той перыяд, калі сяляне не былі асабліва абцяжараныя гаспадарчымі працамі. У межах згаданай мясцовасці асабліва распаўсюджаных імён не заўважана, як не адшукана звестак і аб імёнах-абярэгах.

У 1758—1760 гг. у метрычнай кнізе Жодзінскай царквы фіксуецца 10—12 хрышчэнняў, якія галоўным чынам прыходзяцца на летнія месяцы.

Далей колькасць хрышчэнняў павялічылася. У сярэднім за год фіксавалася хрышчэнне 14—15 чалавек, пры максімальнай колькасці хрышчаных у 1775 і 1777 гг. (18 чал.) і мінімальнай у 1782 г. (9 чал.). Найбольшая колькасць хрышчэнняў прыходзілася на зімовыя месяцы (люты — 21, снежань — 19, студзень — 18), найменшая — на веснавыя (красавік — 6, сакавік — 5).

Перад тым каб павянчацца ў парафіі Пагосцкай царквы, неабходна было прайсці трайное агалошванне будучай падзеі шлюбу, якое здзяйсняў святар у нядзелю на працягу трох тыдняў. Калі ў парафіян не было заўваг адносна годнасці жаніха ці цнотнасці нявесты, то шлюб заключаўся бесперашкодна. Статыстыка шлюбаў сведчыць пра тое, што на год іх заключалася ад васьмі да дванаццаці. Сведкамі на заключэнні шлюбаў выступалі двое сялян мужчынскага полу, як правіла, з ліку сяброў, родзічаў, добрых суседзяў. Адбывалася вянчанне не толькі ў асноўнай царкве парафіі, але таксама ў Дулебскай капліцы [3, арк. 63]. Большая частка вянчанняў прыходзілася на вольны ў сельскагаспадарчым плане кастрычнік. Так, у 1759 г. з сямі заключаных шлюбаў шэсць прыходзіліся на гэты месяц [3, арк. 63 адв.—64]. У наступным 1760 г. усе шлюбы прыходзіліся на кастрычнік [3, арк. 62 адв.—63 адв.].

Пры аналізе метрычных запісаў аб смерці найперш заўважаецца непазначэнне ў метрычнай кнізе Мсціслаўскай царквы імёнаў асоб, маладзейшых за 17 гадоў. Для беларускай вёскі заўсёды была характэрная вялікая дзіцячая смяротнасць, з чаго можна зрабіць выснову адносна фіксацыі ў кнізе толькі дарослых нябожчыкаў. Узрост, як правіла, падаецца прыблізна, і адпаведна фіксуюцца толькі круглыя лічбы — 20, 30, 50 гадоў.

Пэўным параметрам штодзённасці, які можна вылучыць на падставе гэтых кніг, з’яўляецца статыстыка смяротнасці. У дадзеным кантэксце неабходна вызначыць, на які час прыходзіцца найбольшая колькасць выпадкаў смерці. У 1795—1800 гг. такімі месяцамі для парафіі Шыпянскай царквы з’яўляюцца сакавік (22) і красавік (26 выпадкаў). Згаданая статыстыка вельмі адпавядае характарыстыцы сакавіка і красавіка як самых галодных і багатых на захворванні месяцаў. Найменш смярцей прыходзілася на летнія месяцы (чэрвень — 6, ліпень — 8, жнівень — 8). Аднак замоўчванне інфармацыі аб дзіцячай смяротнасці не дазваляе лічыць дадзеныя звесткі абсалютна дакладнымі. Прычыны смерці ў гэтай метрычнай кнізе не асвятляюцца.

У супрацьвагу метрыкам аб смерці Шыпянскай уніяцкай царквы ў Мсціслаўскай Афанасьеўскай царкве згадваюцца памерлыя дзіцячага ўзросту [7, арк. 1—30 адв.]. У запісах аб памерлых зрэдку падаюцца і

даволі цікавыя акалічнасці. Так, 10 лістапада 1782 г. памерла ўдава Еўфрасіння, убогая з вёскі Рожава, а 4 снежня 1782 г. «нячаянную смерць» прыняў мешчанін Мсціслаўля Якаў Малышэвіч [7, арк. 29 адв.].

Разам з афіцыйнымі формамі імён у метрычных кнігах Жодзінскай царквы ўжываюцца таксама простанародныя формы. Так, 25 чэрвеня 1759 г. быў хрышчаны Манусь Калінчык, а праз два дні — хлопчык з імем Мануіл Матусевіч [2, арк. 13]. Іншымі побытавымі формамі кананічных імён з'яўляюцца Алесь, Бася, Грыпіна, Саўка, Стася, Францысь, Хадося, Хвеська, Цімох.

У 1755—1757 гг. на аркушах метрычнай кнігі Гатаўскай царквы згадваюцца 31 мужчынскае і 18 жаночых імён хрышчаных дзяцей. Сярод мужчынскіх дамінавалі Іаан (7 выпадкаў хрышчэння), Стафан (6), Тэадор (5); сярод жаночых — Агафія (7), Ганна (6), Еўдакія (5). У 1785—1787 гг. колькасць жаночых імён павялічылася да 34, у той жа час колькасць мужчынскіх засталася той жа — 31. Такі феномен звязаны з павялічаным узроўнем колькасці хрышчаных (а значыць, і народжаных) у гэтыя гады дзяўчынак у параўнанні з хлопчыкамі — 63 : 37. У папярэдні перыяд 1755—1757 гг. колькасць хлопчыкаў пераважала над колькасцю дзяўчынак — 54 : 43. Пашыранымі жаночымі імёнамі ў гэты перыяд былі Агафія (9), Параскева (8), Кацярына (4); мужчынскімі — Аўксентый (4), Адам (3). Імёнамі, што сустракаюцца ў згаданай крыніцы, але мала распаўсюджаны ў іншых мясцовасцях, з'яўляюцца Аўксентый, Януарый, Ясон, Калінік, Глікерыя, Уксымія.

У той час як у метрычнай кнізе Гатаўскай царквы падаюцца кананічныя формы імён дзяцей і бацькоў, то ў кнізе Мацеевіцкай царквы за 1773—1779 гг. кананічнымі з'яўляюцца толькі імёны большасці хрышчаных. Імёны бацькоў падаюцца ў формах бытавання, што дазваляе назіраць іх у выглядзе паўсядзённага ўжывання. Зрэдку сустракаюцца некананічныя формы імён, якія выкарыстоўваліся парафіянамі Мацеевіцкай царквы — Агапа, Алесь, Анан, Аўдзюха, Варуша, Гарпіна, Грышка, Іоўка, Кірый, Паўлюк, Параскія, Парася, Хводар, Хоўра. За гэты перыяд занатавана два выпадкі хрышчэння дзяцей, бацькі якіх не пазначаны. Аднак гэта хутчэй выпадковасць, чым згадка пра існаванне байструкоў [4, арк. 4]. Вылучаюцца тры асноўныя формы падачы прозвішчаў бацькоў хрышчаных — «ад бацькі Яна Бурага і ад маці Аўдзюхі» [4, арк. 1], «ад бацькі Хводара Самца і ад маці Агапы Шыдлоўскай» [4, арк. 4 адв.], «ад бацькі Якава Мароза і ад маці Ганны Марозавых» [4, арк. 13]. Адсутнасць формы складання метрычнага запісу ўказвае на тое, што дадзеная метрычная кніга з'яўляецца прыходскім экзэмплярам. Такім чынам,

можна зрабіць выснову аб асаблівай важнасці прыходскага экзэмпляра для рэканструкцыі сялянскай штодзённасці.

Праваслаўная метрыка аб народжаных Мсціслаўскай царквы за 1780 г. змяшчае выключна поўныя кананічныя імёны дзяцей і бацькоў, сярод якіх распаўсюджанасцю карыстаюцца Іван (Іаан) — 9 выпадкаў, Еўфрасінія — 7 выпадкаў, Марыя — 5 выпадкаў [7, арк. 1—4 адв.].

У каталіцкіх метрыках Слуцкага касцёла сярод жыхароў набліжаных да горада вёсак фіксуюцца імёны Агнета, Ганна, Еўдакія, Лукаш, Магдалена, Марыяна, Сымон, Тэадор, Францыск, Ян. Асабліва дзіўным з'яўляецца ўжыванне імя Еўдакія [6, арк. 121 адв.]. У той час калі шляхцічы пішуцца ў метрыках з падачай імён і прозвішчаў бацькоў (таксама дзявочага прозвішча маці), то ў метрычных запісах, дзе фігуруюць сялянскія бацькі, такая дакладнасць існуе не заўсёды. Так, у красавіку 1764 г. былі хрышчаны два сялянскіх хлопчыкі з імем Францыск. Бацькамі аднаго называюцца Ян і Тэадора Шчукаўна, бацькамі другога называюцца Ян і Еўдакія Туры [6, арк. 121—121 адв.]. У першым выпадку не фіксуецца агульнае прозвішча бацькі і маці, у другім — дзявочае прозвішча маці. Акрамя таго, даволі часта імёны хрышчаных сялян проста прапускаліся, як у выпадку з сынам Лукі і Ганны Клімкаў, хрышчанага 28 лютага 1764 г. [6, арк. 121]. Калі ў дадзенай кнізе даволі дакладна перадаецца ўся інфармацыя, занатаваная ў прыходскім экзэмпляры, то можна зрабіць выснову, што каталіцкі святар згаданай парафіі не надаваў асаблівага значэння дакладнаму адлюстраванню сямейна-роднасных дачыненняў паміж імі.

Немалаважным аспектам штодзённага жыцця з'яўляюцца ўзаемаадносіны святарскай сям'і з сялянамі. Аб гэтым можа сведчыць метрычная кніга Пагосцкай царквы, якая цалкам складзена ў часы служэння ў парафіі прадстаўнікоў грэка-каталіцкага святарскага роду Нарановічаў. У 1726—1745 гг. святаром значыцца Юрый Ян Нарановіч (верагодна, сын Пятра Нарановіча) [3, арк. 1—18], пачынаючы з 20 студзеня святарскія абавязкі ажыццяўляў Аляксандр Нарановіч (верагодна, сын Юрыя Яна) [3, арк. 18—56 адв.], якога, у сваю чаргу, у красавіку 1766 г. замяніў яго сын Тэадор Нарановіч [3, арк. 56 адв.—57 адв.]. Аднак, як сведчаць далейшыя дакументы, бацька яшчэ не адышоў ад спраў, а пакінуў свайго сына толькі вікарыем. У 1774 г. Аляксандр Нарановіч за ўласныя грошы ўзвёў на царкоўным цвінтары капліцу [1, арк. 14 адв.].

Такім чынам, асноўныя параметры прыватнай і грамадскай штодзённасці, якія магчыма вылучыць пры разглядзе метрычных кніг: 1) час правядзення абраду хрышчэння (на які час прыходзілася найбольшая

колькасць хрышчэнняў, з чым дадзеная з'ява звязана); 2) час заключэння шлюбаў (на які час прыходзілася найбольшая іх колькасць, з чым звязана); 3) асаблівасці смяротнасці (на які час прыходзіцца, з чым звязана); 4) прычыны смерці (хвароба, забойства, няшчасны выпадак і г. д.); 5) імёны (распаўсюджанасць, формы, імёны-абярэгі); 6) удзел святароў (ці шляхты) у якасці сведак ці хросных у сялян.

Метрычныя запісы XVIII ст. не фіксуюць падзею нараджэння, вельмі рэдка раскрываюць прычыну смерці, аднак дазваляюць зрабіць назіранне ў шэрагу іншых накірункаў. Так, запісы аб хрышчэнні, вянчанні і смерці найчасцей прыходзяцца на вызначаныя сезоны сельскагаспадарчага календара. Пры аналізе метрычных запісаў аб хрышчэнні было высветлена, што для кожнай мясцовасці характэрны свой уласны антрапанімікон, а менавіта сукупнасць імён, найбольш распаўсюджаных у мясцовасці. Антрапанімічная інфармацыя з пэўнага экзэмпляра метрычнай кнігі таксама ўказвае на прыналежнасць яго да ліку прыходскіх або дэканацкіх. Удзел святароў і прадстаўнікоў іх сем'яў у падзеях вясковага жыцця мог праяўляцца не толькі праз прамое дачыненне да жыцця социуму падчас ажыццяўлення таямніц хрышчэння, вянчання і адпявання, але і праз выступленне ў якасці кумоў на радзінах і сведак на заключэнні шлюбу. Гэта часцей залежала ад ступені інкарпараванасці пэўнай святарскай сям'і ў сялянскае асяроддзе, часу яе знаходжання ў пэўным прыходзе і аўтарытэту сярод вяскоўцаў.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 136. Воп. 1. Спр. 41239. Візіты цэркваў Пухавіцкага і Ігуменскага дэканатаў. 1774 г.

2. НГАБ. Ф. 136. Воп. 13. Спр. 790. Метрычная кніга аб хрышчаных і шлюбаваных Жодзінскай царквы Барысаўскага пав. 1745—1771 гг.

3. Тамсама. Спр. 1068.—Метрычная кніга аб хрышчаных і шлюбаваных Пагосцкай царквы Аршанскага пав. Віцебскага ваяв. 1707—1766 гг.

4. Тамсама. Спр. 1127. Метрычная кніга аб хрышчаных і шлюбаваных Мацеевіцкай царквы Мінскага пав. 1773—1793 гг.

5. Тамсама. Спр. 1294. Метрычная кніга аб хрышчаных Гатаўскай царквы Мінскага пав. 1730—1786 гг.

6. НГАБ. Ф. 937. Воп. 4. Спр. 230. Метрычныя кнігі Слуцкага парафіяльнага касцёла, 1701—1797 гг.

7. НГАБ. Ф. 2301. Воп. 2. Спр. 144. Метрычныя кнігі Мсціслаўскіх цэркваў, 1778—1784 гг.

Артыкул пастпуіў у рэдакцыю 10 чэрвеня 2012 г.